На ўсе пытанні будуць дадзены адказы

Падведзены вынікі работы «гарачай лініі» падчас Усебеларускага сходу

За два дні работы «гарачай лініі» падчас пятага Усебеларускага народнага сходу было разгледжана больш за паўтысячы зваротаў. Большасць з іх тычылася жыллёва-камунальнай гаспадаркі, будаўніцтва і жылля, сацыяльнага забеспячэння, працоўных адносін, аховы здароўя, аграпрамысловага комплексу.

Фота БЕЛТА.

«Усе пытанні, якія паступілі ў гэтыя два дні, накіраваныя ў адпаведныя дзяржаўныя органы для разгляду. Хачу адзначыць, што кожнаму, хто датэлефанаваўся, будуць дадзены адказы ва ўстаноўленыя тэрміны. Ні адзін званок, ні адзін зварот не застанецца без увагі», — сказаў **Аляксей ЦВЯТКОЎ, кіраўнік «гарачай лініі».** Паводле яго слоў, за час работы лініі паступіла 538 зваротаў. У разрэзе рэгіёнаў яны размеркаваліся наступным чынам: Мінск — 208, Мінская вобласць — 84, Брэсцкая і Гомельская — па 55, Магілёўская — 48, Віцебская — 47, Гродзенская — 41.

Большасць зваротаў на «гарачую лінію» паступіла ад жыхароў сталіцы. Па словах **Андрэя ШОРЦА, старшыні Мінгарвыканкама,** мінчан поруч з іншымі пытаннямі цікавілі і звязаныя з сацыяльным забеспячэннем. Так, у сталіцы да 1 ліпеня будзе здадзена дзіцячая паліклініка ў Каменнай Горцы, да канца года — дарослая, а дзіцячая — у Брылевічах, таксама новы корпус дзіцячай інфекцыйнай бальніцы. Што тычыцца ўстаноў адукацыі, то да канца года плануецца адкрыць два дзіцячыя садкі ў Каменнай Горцы, адзін — у Маскоўскім раёне і школу ў Масюкоўшчыне.

Большасць пытанняў, якія паступілі на «гарачую лінію» — каля 100 — тычылася ЖКГ. Як паведаміў **Аляксандр ЦЕРАХАЎ, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі,** адзін з блокаў такіх зваротаў звязаны з прыватызацыяй жылля. Па словах міністра, цяпер у прыватнай уласнасці знаходзіцца больш за 95% жылля, прыватызавана 1,5 мільёна кватэр. «З выхадам указа №563 вызначана, што з 1 ліпеня ўсе жылыя памяшканні дзяржаўнага жыллёвага фонду пераходзяць у арэнднае жыллё. У сувязі з завяршэннем прыватызацыі ўрадам быў распрацаваны план мерапрыемстваў, якім прадугледжана апавяшчэнне ўсіх наймальнікаў дзяржаўных кватэр, якія маюць права на прыватызацыю. Акрамя таго, забяспечаны прыём дакументаў у чэрвені ў будныя і выхадныя дні да 20.00, у апошні тыдзень месяца — з 6.00 да 24.00. Такім чынам створаны ўмовы, каб грамадзяне, якія па якіх-небудзь прычынах не змаглі падаць заяву, змаглі гэта зрабіць», — падкрэсліў Аляксандр Церахаў.

Уладзімір ПАТУПЧЫК, міністр энергетыкі Беларусі, адзначыў, што ў яго галіне паступіла 18 зваротаў, і асобна закрануў пытанні, звязаныя з разлікамі за газ і электраэнергію для асобных катэгорый грамадзян — пенсіянераў. «Летам яны з'язджаюць з гарадоў у сельскія населеныя пункты, дзе жывуць у набытых або атрыманых па спадчыне дамах, у якіх ніхто не зарэгістраваны. Варта адзначыць, што парадак аплаты насельніцтвам паслуг электра- і газазабеспячэння рэгулюецца пастановай Саўміна, у якой прапісана, што тарыфы, якія субсідзіруюцца дзяржавай, на ўказаныя паслугі прымяняюцца па асноўным месцы жыхарства для ўсіх катэгорый грамадзян без выключэнняў. Неабходнасць увядзення такога парадку абумоўлена наяўнасцю ў асобных грамадзян двух і больш жылых памяшканняў, дзе ніхто не зарэгістраваны. У такіх выпадках электраэнергія і газ аплачваюцца па тарыфах, якія забяспечваюць поўнае пакрыццё эканамічна абгрунтаваных затрат», — растлумачыў ён. Але нагадаў, што для асобных катэгорый грамадзян, у тым ліку для непрацуючых пенсіянераў, існуюць выключэнні. Варта толькі часова зарэгістравацца праз сельсавет, на тэрыторыі якога знаходзіцца лецішча...

Анатоль ЧОРНЫ, міністр архітэктуры і будаўніцтва, паведаміў, што для шматдзетных сем'яў, якія будуюць індывідуальнае жытло, будуць адшуканы сродкі для дадатковага крэдытавання. Такое рашэнне, па яго словах, было прынята прэм'ер-міністрам. Для гэтага спатрэбіцца выдаткаваць 450 мільярдаў рублёў, якія яшчэ належыць адшукаць. Таксама шэраг пытанняў тычыўся і сферы медыцыны, у асноўным — лекавага забеспячэння. Напрыклад, аб незарэгістраваных у краіне леках і забеспячэнні ферментазамяшчальнай тэрапіі пацыентаў з рэдкімі генетычнымі захворваннямі, паведаміў **міністр аховы здароўя Васіль ЖАРКО.**

Міністр працы і сацыяльнай абароны Беларусі Марыяна ШЧОТКІНА заявіла, што павышэння пенсій беларусам варта чакаць у другім паўгоддзі (пра гэта паступалі пытанні на «гарачую лінію»). Таксама звярталіся і з прапановамі зрабіць надбаўку да пенсіі доўгажыхарам — старэйшым за 90 гадоў, што, па словах міністра, будзе разгледжана, а таксама «дзецям вайны», што разглядаць не плануецца. Акрамя таго, на лінію паступіла прапанова 2017 год зрабіць Годам сям'і. «Цудоўная прапанова. Мы яе абавязкова разгледзім», — адзначыла міністр.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

■ Меркаванні

ГАЛОЎНАЕ — НЕ ПАРУШЫЦЬ РАЎНАВАГУ

Міхаіл ВІШНЕЎСКІ, загадчык кафедры філасофіі МДУ імя Куляшова:

— Усебеларускі народны сход — вельмі станоўчая і важная падзея. Гэта магчымасць зноў выверыць курс, пазіцыі шырокіх слаёў беларускага народа. Я слухаў фрагменты даклада Прэзідэнта і ўважліва прачытаў яго цалкам. Вельмі канструктыўная галоўная думка — пазбягаць непрадуманых крокаў, рэфарматарскага свербу. Калі нешта паспешліва ламалася, неабдумана ўводзілася ў дзеянне, узнікала шмат праблем. Вынік атрымліваўся не той, які чакалі. Асабліва небяспечна паспешлівасць у сферы адукацыі. Спробы прыхапкам нешта радыкальна перайначыць, вельмі небяспечныя пры рабоце з дзецьмі. Бо тут наша будучае закладваецца. Тут кожны крок павінен быць добра прадуманы і ўзважаны. Добрыя падручнікі не нараджаюцца хутка. Новыя падыходы ў адукацыі наогул не павінны нараджацца хутка, яны павінны быць апрабаваны. Агульная настроенасць кіраўніка дзяржавы стрымліваць рэфарматарскі запал мне здаецца вельмі слушнай.

Зразумела, што эканоміка краіны апынулася ў няпростым становішчы не па нашай віне. Тут адбіваецца цяжкая спадчыннасць мінулага. Раптоўна, у адно імгненне лідарам не станеш. Калі размова ідзе пра лідарства той жа Еўропы, то трэба прызнаць, што за гэтым стаяць стагоддзі развіцця ў асаблівых умовах. Напрыклад, каланіяльныя імперыі, якія заклалі аснову багацця значнай часткі сённяшніх еўрапейскіх краін. Стартавыя ўмовы спрыяльныя для гэтай групы краін стваралiся не сёння. У Беларусі нічога такога за плячыма няма. Яна ніколі не была імперскай дзяржавай, не выцягвала сокі ні з Афрыкі, ні з Амерыканскага кантынента. Таму нельга разлічваць на тое, што мы вельмі хутка выйдзем на ўзровень еўрапейскіх краін, якія свае багацці будавалі на няшчасці цэлых народаў. Успомніце, маленькая Бельгія і вялікае бельгійскае Конга, невялікая Галандыя і велізарная Інданезія, якая ў свой час стала яе калоніяй. Іспанія — і палова амерыканскага кантынента. Такія рэчы не трэба забываць, калі кажам пра сённяшні дзень. Я ўжо маўчу пра французскую, англійскую каланіяльныя імперыі. У нас сапраўды розныя стартавыя магчымасці.

Галоўнае, пераўтварэннямі не ўзарваць раўнавагу, не парушыць грамадскай згоды. Для таго, каб зрабіць рывок і наблізіцца да сусветных лідараў у эканоміцы, трэба вялікае напружанне сіл, а гэта стварае пэўныя рызыкі. Ва ўмовах грамадскага расколу ніякія эканамічныя задачы не будуць вырашаны. Перш за ўсё трэба, каб наша цэласнасць як беларускага народа была захавана. Калі той жа Кітай пераадольваў катастрафічнае становішча, у якім ён апынуўся, адбілася гэтая глыбінная ідэя, якая аб'яднала кітайскі народ. Нягледзячы на тое, што кітайцам прыйшлося прайсці складаны шлях, яны засталіся аптымістамі. І нам трэба браць з іх прыклад. Галоўнае не страціць адчування адзінства, нацыянальнай цэласнасці, нацыянальнай годнасці.

Тамара ДАЎГАШЭЙ, галоўны ўрач Гродзенскага абласнога клінічнага кардыялагічнага цэнтра, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:

— Што тычацца развіцця медыцыны, Прэзідэнт агучыў тыя задачы, якімі мы займаемся ўжо цяпер. Гэта развіццё фармацэўтычнага рынку — прасоўванне айчынных лекавых сродкаў і стварэнне іх свабоднага руху на тэрыторыі Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Я магу як доктар канстатаваць, што якасць айчынных лекаў належная, і субстанцыі, з якіх іх робяць, закупляюцца ў адным і тым жа месцы і заходнееўрапейскімі канцэрнамі, і нашымі беларускімі фармацэўтычнымі прадпрыемствамі. Якасць належная, а суадносіны кошту і якасці аптымальныя. Таксама зараз актыўна адбываецца развіццё першаснай медыка-санітарнай дапамогі, сістэмы ўрачоў агульнай практыкі, сямейнага ўрача, памочніка доктара і ў прынцыпе ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай і кадравай базы амбулаторна-паліклінічных устаноў. У цэлым, у ідэале, чалавек павінен атрымаць дыягнастычную дапамогу ў той медыцынскай установе, у якую ён звярнуўся перш-наперш. А правесці якасную дыягностыку можна і ў амбулаторна-паліклінічных установах, калі яны належным чынам аснашчаныя. Гэта б значна разгрузіла месцы ў стацыянарах, якія б заставаліся для экстраннай паталогіі.

Нэлі ЗІГУЛЯ, Вераніка ПУСТАВІТ.

■ Прыярытэты

ГОНАР КРАІНЫ

Афіцэрскі корпус вышэйшага звяна папоўніла больш як сто чалавек

Адбыўся чарговы выпуск слухачоў Генеральнага штаба Узброеных Сіл і выпускнікоў камандна-штабнога факультэта Ваеннай акадэміі Беларусі.

— Гэтая падзея яшчэ раз пацвярджае правамернасць стварэння ўласнай сістэмы ваеннай адукацыі ў Беларусі, якая паказвае сваю высокую эфектыўнасць, — адзначыў **міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ.** — У гэтым страі стаяць людзі, для якіх служэнне Айчыне стала найвышэйшай узнагародай і сэнсам жыцця. Людзі, якія сваім прафесіяналізмам і бездакорнай службай заслужылі права кіраваць калектывамі, а значыць прымаць рашэнні і несці адказнасць перад усім беларускім народам.

Міністр нагадаў, што традыцыйна выпуск адбываецца напярэдадні галоўнага свята беларускай дзяржаўнасці — Дня Незалежнасці. «Незалежнасць краіны — гэта вялізная адказнасць за забеспячэнне яе бяспекі, — звярнуўся да выпускнікоў кіраўнік ваеннага ведамства. — Менавіта гэтую адказнасць прынялі на сябе і вы».

Ваенная акадэмія заўсёды адрознівалася якаснай і сур'ёзнай падрыхтоўкай афіцэрскага корпуса краіны. Але нягледзячы на тое, што засваенне ваеннай навукі патрабуе немалых намаганняў, штогод сярод выпускнікоў знаходзяцца медалісты і ўладальнікі чырвоных дыпломаў. І гэты год не стаў выключэннем. Сярод 24 слухачоў факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сіл і 81 выпускніка камандна-штабнога факультэта — 12 залатых медалістаў і 22 уладальнікі дыплома з адзнакай.

— Але гэта не азначае, што астатнія выпускнікі падрыхтаваныя горш, — удакладніў **начальнік Ваеннай акадэміі генерал-маёр Сяргей БОБРЫКАЎ.** — Для ўсіх іх падчас навучання ў Ваеннай акадэміі былі створаны аднолькавыя ўмовы. Нашы выпускнікі не адарваныя ад жыцця штабоў, войск. У працэсе навучання шмат увагі мы ўдзяляем практычным заняткам (яны складаюць прыкладна 60% ад навучальнага працэсу. — **Аўт.**), і на крайніх стажыроўках, якія папярэднічаюць выпуску, яны прыкладна арыентуюцца на тыя пасады, якія будуць займаць, і ўжо мэтанакіравана да іх рыхтуюцца.

Адукацыя, атрыманая ў сценах Ваеннай акадэміі Беларусі, карыстаецца папулярнасцю і ў іншых краінах. Як расказаў **начальнік факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сіл — намеснік начальніка Ваеннай акадэміі генерал-маёр Андрэй ГУРЦЭВІЧ,** акрамя прадстаўнікоў Узброеных Сіл Беларусі, сёлета з факультэта выпускаюцца прадстаўнікі з Казахстана і Туркменістана. «Для Казахстана гэта ўжо сёмы выпуск, для Туркменістана — трэці, — адзначыў Андрэй Гурцэвіч. — Напрыклад, у нас атрымала адукацыю ўся ваенная эліта Туркменістана: міністр абароны, начальнік Генеральнага штаба, намеснік міністра па тыле, намеснік міністра па ўзбраенні, начальнік нацыянальнай бяспекі Казахстана. Са сцен акадэміі выйшлі камандуючыя акругамі і камандуючы сухапутнымі войскамі Казахстана».

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Дыпломы, якія атрымліваюць нашы ваеннаслужачыя ў Ваеннай акадэміі Беларусі, асабліва на факультэце Генеральнага штаба, вельмі высока цэняцца ў Казахстане, — рэзюмаваў **пасол Казахстана ў Беларусі Ергалі БУЛЕГЕНАЎ.** — Выпускнікі, якія за апошнія гады скончылі гэтую вядомую ва ўсім свеце акадэмію, сёння займаюць высокія пасады ва Узброеных Сілах Рэспублікі Казахстан.

Маёр Аляксей КАВАЛЁЎ, які скончыў камандна-штабны факультэт з залатым медалём, лічыць, што факультэт з'яўляецца важнейшым этапам у структуры ваеннай адукацыі афіцэра. «Навучанне тут — у першую чаргу, гэта атрыманне значнага, вялікага аб'ёму ведаў, якія неабходныя ў далейшай дзейнасці афіцэра, — упэўнены вайсковец. — Акрамя таго, гэта і перспектыва службовага росту, новы вопыт узаемаадносін у калектыве. Нас, выпускнікоў камандна-штабнога факультэта, перапаўняюць пачуцці гонару за прыналежнасць да афіцэрскага корпуса, адказнасці за лёс дзяржавы, любові да Радзімы і свайго народа».

Афіцэрскія пагоны атрымаюць сёння і курсанты Ваеннай акадэміі, а таксама ўсе тыя, хто вучыўся на ваенных факультэтах грамадзянскіх ВНУ краіны. Урачыстыя мерапрыемствы пройдуць таксама ў Гомелі і Гродне. Усяго ў гэты дзень лейтэнантамі стануць каля 700 чалавек.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by